# ПРАКТЫЧНЫ АСПЕКТ ДЗЕЙНАСЦІ А. М. АБРАМОВІЧА Ў ФАРМІРАВАННІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПРАВА

**А. Я. Ляскоў**
*Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь,*
*вул. Карла Маркса, 38, 220016, Мінск, Беларусь*

Разглядаецца значэнне дзейнасці А. М. Абрамовіча ў фарміраванні нацыянальнага права на этапе станаўлення суверэннай Рэспублікі Беларусь. Адзначаецца яго ўдзел у канстытуцыйнай рэформе 1996 года, працэсах кадыфікацыі заканадаўства і планіравання падрыхтоўкі законапраектаў.

***Ключавыя словы*:** А. М. Абрамовіч; канстытуцыйная рэформа; кадыфікацыя; планіраванне; праватворчасць.

# ПРАКТИЧЕСКИЙ АСПЕКТ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ А. М. АБРАМОВИЧА В ФОРМИРОВАНИИ НАЦИОНАЛЬНОГО ПРАВА

**А. Я. Лясков**
*Администрация Президента Республики Беларусь,*
*ул. Карла Маркса, 38, 220016, Минск, Беларусь*

Рассматривается значение деятельности А. М. Абрамовича в формировании национального права на этапе становления суверенной Республики Беларусь. Отмечается его участие в конституционной реформе 1996 года, процессах кодификации законодательства и планирования подготовки законопроектов.

***Ключевые слова*:** А. М. Абрамович; конституционная реформа; кодификация; планирование; правотворчество.

# PRACTICAL ASPECT OF A. M. ABRAMOVICH'S ACTIVITIES IN THE FORMATION OF NATIONAL LAW

**A. Ya. Lyaskov**
*Administration of the President of the Republic of Belarus,*
*38 Karl Marx Street, Minsk 220016, Belarus*

The article examines the importance of A. M. Abramovich's activities in the formation of national law at the stage of the formation of the sovereign Republic of Belarus. His participation in the constitutional reform of 1996, the processes of codification of legislation and planning the preparation of draft laws is noted.

***Keywords*:** A. M. Abramovich; constitutional reform; codification; planning, lawmaking.

Перыяд актыўнай дзейнаці доктара юрыдычных навук, прафесара Абрамовіча Аляксандра Міхайлавіча ў сферы фарміравання нацыянальнага права звязаны з этапам станаўлення суверэннай Рэспублікі Беларусь як дэмакратычнай прававой дзяржавы.

Пасля прыняцця Вярхоўным Саветам БССР 25 жніўня 1991 г. Закона «Аб наданні статуса канстытуцыйнага закона Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР» Беларусь юрыдычна аформіла сваю незалежнасць.

Перад новай дзяржавай і беларускім грамадствам адразу паўстаў шэраг сур'ёзных выклікаў. Адзін з іх – неадпаведнасць масіва савецкага заканадаўства ўзнікшым на той час сацыяльна-эканамічным і палітычным адносінам.

Для пераадолення гэтага выкліку неабходна было фактычна з нуля фарміраваць сістэму права суверэннай дзяржавы, у тым ліку ствараць уласнае нацыянальнае заканадаўства. Такая маштабная задача патрабавала мабілізацыі значных рэсурсаў – адміністрацыйных, навуковых, інтэлектуальных і іншых.

У гэтых умовах узрастала роля спецыялістаў-прафесіяналаў, правазнаўцаў, наватараў, якія маглі задаць тон у выкананні адказнай і складанай работы, выпрацаваць тэарэтычныя і канцэптуальныя асновы для фарміравання нацыянальнага заканадаўства.

Сярод такіх прафесіяналаў А. М. Абрамовіч вылучаўся асаблівай кампетэнтнасцю. Ён быў вядомым навукоўцам у вобласці права. Шмат гадоў працаваў у Акадэміі навук БССР, у тым ліку выконваў абавязкі намесніка аддзела інстытута філасофіі і права гэтай установы. У 1986 г. абараніў доктарскую дысертацыю па праблематыцы, звязанай з вывучэннем шэрагу аспектаў дзяржаўнага кіравання. З 1988 г. ўзначальваў кафедру тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1990 г. яму было прысвоена званне прафесара. У 1991 г. уваходзіў у склад Камітэта канстытуцыйнага нагляду СССР.

Можна сказаць, што ў перыяд станаўлення суверэннай Рэспублікі Беларусь А. М. Абрамовіч дасягнуў піка сваёй творчай формы, быў поўны сіл, ідэй і задумак. У далейшым яго жыццёвыя абставіны склаліся такім чынам, што ён змог рэалізаваць свае веды і вопыт у розных сферах дзяржаўнага будаўніцтва, у тым ліку ў праватворчасці.

З пункту гледжання ацэнкі таго, як развіваліся грамадска-палітычныя працэсы ў Беларусі ў той пераломны (і пераходны) перыяд, А. М. Абрамовіча можна ахарактарызаваць як чалавека сваёй эпохі. Да яго ў пэўным сэнсе можна аднесці словы Гегеля: «Великий человек эпохи тот, который может воплотить в словах волю своей эпохи, сказать

своей эпохе, в чем ее воля и выполнить ее. То, что он делает – сердцевина и суть его эпохи, через него проявляется эпоха» [5].

Прызначэнне 22 студзеня 1996 г. А. М. Абрамовіча на пасаду Намесніка Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, адказнага ў тым ліку за фарміраванне прававога поля, дало магчымасць шырока разгарнуцца яго таленту.

Пра ролю Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ў нарматворчай (уключаючы праватворчую) дзейнасці ён пісаў наступнае: «Необходимо заметить, что координация нормотворческой деятельности является одной из основных и самых важных функций Администрации Президента Республики Беларусь... Нормотворческий процесс должен быть управляемым и координируемым. Это бесспорно. Поэтому именно на выполнение этой задачи направлена деятельность Администрации Президента Республики Беларусь. Можно с удовлетворением отметить, что в целях реализации координирующей функции Администрацией Президента Республики Беларусь сделано немало» [2, с. 555–556].

Вялікі асабісты ўклад унёс А. М. Абрамовіч у якасці Намесніка Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у канстытуцыйнае будаўніцтва, сістэматызацыю заканадаўства, ажыццяўленне планіравання заканадаўчай дзейнасці.

У асабістай размове А. М. Абрамовіч паведаміў аўтару артыкула, што самым важным сваім дасягненнем у сферы фарміравання нацыянальнага права ён лічыць удзел у падрыхтоўцы праекта абноўленай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у 1996 г.

Вядома, што прыняты ў 1994 г. Асноўны Закон меў значныя хібы прававога рэгулявання працэсу дзяржаўнага кіравання. Галоўнае – ён не забяспечваў неабходнага балансу інтарэсаў галін улады, не прадугледжваў дзейсных інструментаў для пераадолення супярэчнасцяў паміж імі.

Асабліва востра праяўлялася непрапарцыянальная роля Парламента – Вярхоўнага Савета – у механізме ажыццяўлення дзяржаўнай улады, што аб’ектыўна прывяло да канфлікту заканадаўчага органа з Прэзідэнтам краіны.

А. М. Абрамовіч так ацэньваў склаўшуюся на той час сітуацыю: «Практыка дзяржаўнага будаўніцтва за мінулы перыяд выявіла сур’ёзныя недахопы ў канстытуцыйным забеспячэнні і функцыянаванні цэнтральных дзяржаўных органаў – як ва ўзаемадзеянні іх паміж сабой, так і ў рэалізацыі іх непасрэдных функцый. Агульнавядома, што Канстытуцыя 1994 г. хаця і дэкларавала прынцып падзелу ўладаў і ўвяла пасаду прэзідэнта ў якасці кіраўніка дзяржавы і выканаўчай улады, тым не менш па зместу засталася канстытуцыяй, заснаванай на монаўладзе, пры якой усе іншыя органы фактычна і юрыдычна падкантрольны і падсправаздачны адной уладзе, у нашым выпадку – савету дэпутатаў» [3, с. 564].

Адзіна магчымым выхадам з палітычнага крызісу 1996 г. было правядзенне канстытуцыйнай рэформы.

А. М. Абрамовіч знаходзіўся ў эпіцэнтры працэсаў, звязаных з падрыхтоўкай гэтай рэформы. Так, ён узначаліў створаную распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 верасня 1996 г. № 272рп камісію па абагульненню прапаноў і заўваг па праекту змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Менавіта гэтай камісіі было даручана прадставіць на разгляд Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь канчатковы тэкст праекта змяненняў і дапаўненняў Асноўнага Закона для вынясення яго на рэспубліканскі рэферэндум.

На думку А. М. Абрамовіча, пры карэкціроўцы Канстытуцыі патрэбна было вырашыць складаныя тэарэтычныя пытанні, звязаныя з больш дакладным вызначэннем прававога статуса Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а таксама кампетэнцыі і ўзаемадзеяння галін дзяржаўнай улады ў рэчышчы павышэння эфектыўнасці дзяржаўнага кіравання.

Пры падрыхтоўцы канстытуцыйных змяненняў улічваўся замежны вопыт. Асаблівая ўвага надавалася вывучэнню Канстытуцыі Французскай Рэспублікі 1958 г.

У выніку дзейнасці камісіі пад кіраўніцтвам А. М. Абрамовіча быў выпрацаваны такі праект новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, які замацоўваў больш дасканалую сістэму органаў дзяржаўнай улады.

Так, прадугледжвалася, што Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь набудзе статус Кіраўніка дзяржавы, які не ўваходзіць ні ў адну з галін улады, але стане для іх вярхоўным арбітрам, будзе каардынаваць і накіроўваць іх дзейнасць у мэтах забяспячэння ўстойлівасці ўсяго дзяржаўнага механізма і прадухілення ўзнікнення супярэчнасцяў паміж галінамі ўлады.

У сваю чаргу, Парламент стане двухпалатным і будзе называцца Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь. Ніжняя палата – Палата прадстаўнікоў – задумвалася як орган, які фарміруецца на аснове ўсеагульнага прамога выбарчага права. Верхняя палата – Савет Рэспублікі – павінна была стаць палатай тэрытарыяльнага прадстаўніцтва.

Увядзенне двухпалатнага Парламента А. М. Абрамовіч лічыў адным з фактараў забеспячэння балансу ў дзейнасці органаў дзяржаўнай улады. Ён адзначаў: «Вядома, што кожная галіна ўлады як пэўны сацыяльны арганізм імкнецца расшырыць свае функцыі, а значыць, і паўнамоцтвы, гэта аб’ектыўны закон, ён дзейнічае і ў іншых краінах. Аднак у аптымальнаарганізаваных дзяржаўных сістэмах прадугледжваюцца механізмы, якія функцыянуюць як стрымліваючыя не толькі паміж living рознымі галінамі ўлады, але і ўнутры саміх гэтых галін улад…

Такім стрымліваючым механізмам для заканадаўчай улады з’яўляецца двухпалатная сістэма… Пры двухпалатнай сістэме парламента,

з аднаго боку, існуе спецыяльны прафесіянальны орган, які працуе ў галіне законатворчасці – гэта палата дэпутатаў або прадстаўнікоў; другая палата выконвае, па-першае, экспертна-кантрольныя функцыі. Яна, напрыклад, на нейкі момант можа затрымаць увядзенне ў жыццё не адпавядаючым яго патрабаванням законаў… Другая палата магла б таксама вырашаць пытанні, звязанныя з прызначэннем вышэйшых службовых асоб дзяржавы ў межах кампетэнцыі парламента. І нарэшце, падкрэслім: другая палата адлюстроўвала б пераважна не столькі палітычныя, колькі рэгіянальныя інтарэсы, што вельмі важна для ўстойлівага функцыянавання дзяржаўнага механізма» [3, с. 565].

Пасля адабрэння на рэспубліканскім рэферэндуме 24 лістапада 1996 г. адпаведных канстытуцыйных змяненняў у Рэспубліцы Беларусь была сфарміравана збалансаваная і ўстойлівая сістэма органаў дзяржаўнай улады, якая, што называецца, вытрымала выпрабаванне часам і засведчыла сваю эфектыўнасць.

Яшчэ адзін важны аспект дзейнасці А. М. Абрамовіча ў фарміраванні нацыянальнага права – гэта, безумоўна, удзел у працэсе кадыфікацыі заканадаўства. Прычым больш правільна будзе сказаць, што ён быў натхняльнікам, ідэолагам і арганізатарам кадыфікацыі.

Для А. М. Абрамовіча кадыфікацыя была ключавым метадам удасканалення ўсяго заканадаўства і ўскосным фактарам забеспячэння стабільнасці сацыяльна-эканамічнай сістэмы дзяржавы. Ён адзначаў: «Совершенствование многочисленных текущих нормативных актов, регламентирующих отношения как в экономической, так и в социальной сферах, связано с принятием целого ряда других новых комплексных, или, как еще говорят, основополагающих, консолидированных актов – кодексов. Основная ставка на коренное улучшение социально-экономического и иного законодательства путем его систематизации и кодификации сделана именно в 1997 г. Это связано с тем, что только таким путем можно создать обновленную правовую основу прогрессивного социально-экономического развития в стране, что, безусловно, является главным» [1, с. 540].

Асаблівасцю кадыфікацыі ў той перыяд было тое, што гэты працэс насіў вельмі амбіцыйны характар, бо ставілася задача ў сціслыя тэрміны прыняць кадыфікаваныя акты, якія б забяспечвалі прававое рэгуляванне розных сфер грамадскіх адносін.

Думаецца, што такая ўвага А. М. Абрамовіча да праблемы кадыфікацыі была абумоўлена ў першую чаргу тым, што ён бачыў нацыянальную сістэму заканадаўства як комплекс навукова абгрунтаваных і ўзаемазвязаных нарматыўных прававых актаў, аснову якога складаюць менавіта сістэматызаваныя заканадаўчыя акты – кодэксы.

Паказальна, што ў распрацаванай пад кіраўніцтвам А. М. Абрамовіча Канцэпцыі ўдасканалення заканадаўства Рэспублікі Беларусь, зацверджанай Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 10 красавіка 2002 г. № 205, прама сцвярджалася, што адметная рыса заканадаўства Рэспублікі Беларусь – імкненне да актыўнай кадыфікацыі і кансалідацыі нарматыўных прававых актаў, што сведчыць аб тэндэнцыі да сістэмнай нарматворчасці [6].

Гаварылася аб тым, што галіны заканадаўства базіруюцца на кодэксах, за выключэннем тых галін, кадыфікацыя каторых з'яўляецца цяжкай, альбо несвоечасовай. Такія галіны павінны засноўвацца на комплексе кансалідаваных законаў. Кодэкс або кансалідаваны закон вызначаюць асноўныя інстытуты канкрэтнай галіны заканадаўства, а таксама нарматыўныя прававыя акты, якія неабходна прыняць [6].

Бачыў А. М. Абрамовіч і іншыя перавагі кадыфікацыі. Сярод іх – забеспячэнне якасці і стабільнасці заканадаўства, павелічэнне рэгулятыўнай эфектыўнасці права, павышэнне прававой культуры грамадзян, для якіх кодэкс з'яўляецца больш даступным і зразумелым дакументам, чым іншыя нарматыўныя прававыя акты.

Выступаючы на адкрыцці навукова-практычнай канферэнцыі «Актуальныя пытанні нарматворчасці ў Рэспубліцы Беларусь» 21 снежня 2000 г. А. М. Абрамовіч асабліва выдзяліў дасягнутыя поспехі ў справе кадыфікацыі нацыянальнага заканадаўства. Ён падкрэсліў, што за перыяд з 1996 па 2000 г. ў Рэспубліцы Беларусь удалося прыняць рэкордную колькасць кадыфікаваных нарматыўных прававых актаў – 17, у той час як у Расійскай Федэрацыі было прынята 8 кодэксаў, у Кыргызстане – 14, у Казахстане – 7, у Малдове – 3, а на Ўкраіне – ніводнага кодэкса [4, с. 4].

Завяршыць работу па сістэматызацыі заканадаўства, на думку А. М. Абрамовіча, павінна была падрыхтоўка Зводу законаў Рэспублікі Беларусь, як поўнага сістэматызаванага корпуса заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь [4, с. 4].

Вялікае значэнне мела практычная дзейнасць А. М. Абрамовіча і для планіравання працэсу падрыхтоўкі законапраектаў (з 1998 г. указамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь зацвярджаюцца планы падрыхтоўкі законапраектаў у Рэспубліцы Беларусь), прыняцця шэрагу знакавых законаў: «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь», «Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь», «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь», «Аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным уладкаванні Рэспублікі Беларусь», «Аб зваротах грамадзян» і іншых.

У цэлым можна сказаць, што многія канцэптуальныя ідэі А. М. Абрамовіча былі рэалізаваны ў працэсе фарміравання нацыянальнага права. Ён валодаў, сярод іншага, магутнай інтуіцыяй. І гэта ў тым ліку дапамагло А. М. Абрамовічу прымаць стратэгічныя, скіраваныя ў будучыню рашэнні, якія на многія гады прадвызначылі далейшыя шляхі развіцця нацыянальнага права.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Абрамович А. М.* Право и социально-экономическое развитие страны // Избр. тр. Минск, 2019. С. 534–546.

2. *Абрамович А. М.* Актуальные вопросы нормотворчества в Республике Беларусь // Избр. тр. Минск, 2019. С. 553–562.

3. *Абрамовіч А. М.* Канстытуцыйная рэформа: праблемы і перспектывы // Избр. тр. Минск, 2019. С. 563–568.

4. *Абрамович А. М.* Вступительное слово Заместителя Главы Администрации Президента Республики Беларусь А. М. Абрамовича на республиканской научно-практической конференции «Актуальные вопросы нормотворчества в Республике Беларусь» // Актуальные вопросы нормотворчества в Республике Беларусь : материалы науч.-практ. конф., 21 дек. 2000 г. / А. М. Абрамович [и др.] ; Нац. центр законопроект. деятельности при Президенте Респ. Беларусь. Минск, 2001. С. 3–5.

5. *Карр Э. Г.* Что такое история? Рассуждения о теории истории и роли историка [Электронный ресурс]. Алматы, 1997. 208 с. URL: https://vk.com/doc-23433303_467427014?hash=m4q9t6qst0bmOudZrBYvh2eOUNRaiO3Zy65IiwrqXik (дата обращения: 06.08.2024).

6. О Концепции совершенствования законодательства Республики Беларусь [Электронный ресурс] : Указ Президента Респ. Беларусь, 10 апр. 2002 г., № 205 // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2024.